Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 61 (28677)

30 САКАВІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV праграма
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



«Алё, гэта міліцыя?»

СТАР. 4



Вечны рухавік інфармацыі

МС



Калі любяць — не кідаюць

МС

ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Міністэрства аховы здароўя ў найбліжэйшы час удзеліць асаблівую ўвагу пажарнай бяспецы ва ўстановах аховы здароўя. Бальніцы — гэта месца з кругласутачным знаходжаннем людзей, некаторым з іх нялёгка перамяшчацца, а значыць, у выпадку магчымай небяспекі яны не змогуць самі пакінуць памяшканне або хутка сарыентавацца пры эвакуацыі. Мы рэгулярна абследуем будынкі і збудаванні, праводзім трэніровачныя мерапрыемствы з медыцынскім персаналам. Урачы часта сутыкаюцца са смерцю, але, калі яна забірае здаровых дзяцей, як здарылася ў Кемераве, з гэтым цяжка змірыцца і няпроста гэта ўсвядоміць. Мы павінны зрабіць усё для таго, каб такога роду трагедыі і выпадкі не паўтараліся».*

ISSN 1990 - 763X
18061

# ПЕРАМОЖЦЫ — ПОБАЧ



Фота БЕЛТА.

Ордэнам «За асабістую мужнасць» і ганаровым званнем «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» узнагароджана біятланістка Надзея СКАРДЗІНА.

## Прэзідэнт сустрэўся з удзельнікамі сёлетніх зімовых Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў

**Нагода была святочная: кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўручыў узнагароды спартсменам і трэнерам за прафесійнае майстэрства і паспяховае выступленне ў карэйскім Пхёнчхане. Размова ў Прэзідэнта атрымалася даволі прадметнай — абмеркавалі праблемныя пытанні і планы на найбліжэйшы час.**

Свой візіт у Палац Незалежнасці алімпійцы пачалі з экскурсіі. Як неаднойчы гаварылася, нашы спартсмены, выступаючы на розных міжнародных спаборніцтвах, робяць такую ж працу, як і дыпламаты, прадстаўляючы Беларусь ва ўсім свеце. Учора яны пабывалі ў залах, дзе праходзяць перагаворы, абмяркоўваюцца актуальныя пытанні нацыянальнай і знешняй палітыкі. Тыя, чые перамогі аб'ядноўваюць і натхняюць, — нашы спартсмены — пасля экскурсіі адправіліся на шчырую размову з кіраўніком дзяржавы.

СТАР. 2

# Рыбацкія пасядзелкі на Вячы



У апошнія дні сакавіка да вусця ракі Вячы, дзе яна ўпадае ў Мінскае мора, з'язджаюцца аматары падлёднай рыбалкі, каб нацешыцца з мармышкай, пасядзець на сакавіцкім сонейку.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА,
Мінскі раён.

■ Перасяленцы

# ХТО ГАТОВЫ ДА ПЕРАМЕН?

Калі прэтэндэнтаў на вакансію вартаўніка — як у мадэльнае агенцтва, а каб стаць дворнікам, прапануюць скласці рэзюме...



**У Гродзенскай вобласці расце колькасць перасяленцаў. У мінулым годзе новы адрас атрымалі 22 беспрацоўныя, гэта на шэсць чалавек больш, чым у папярэднім, 2016-м. Некаторыя пераязджалі цэлымі сем'ямі. Напрыклад, з Гродна за два гады праграмай перасялення скарысталіся шэсць сем'яў. У гарадскім цэнтры занятасці вырашылі гэту работу пашырыць і правялі тыдзень перасялення.**

СТАР. 5